Умілаваныя ў Хрысце Пану Браты і Сёстры! Дарагія Дыяцэзіяне!

Аўтар: Біскуп Гродзенскі
20.12.2020 00:00



У таямніцы Уцелаўлення Пан Бог паказвае нам сваю чулую любоў, прыніжаючы сябе да мізэрнасці чалавека, каб быць Эмануэлем – Богам з намі. Няхай бязмернасць гэтай Божай любові напоўніць сэрцы ўдзячным здзіўленнем, бязмежнай радасцю і дзіцячым даверам. Няхай народзіць у нас гарачае жаданне дзяліцца любоўю з кожным, каго спаткаем на сваім жыццёвым шляху.

Жадаю ўсім Вам поўных радасці, душэўнага супакою, надзеі і аптымізму свят Божага Нараджэння, а таксама шчодрасці ўсялякіх ласкаў у новым 2021 годзе Панскім! З пастырскім бласлаўленнем